View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE



**УДК 81' 373' 2 : 821.161.3**

**ТАПАНІМІКОН ЗБОРНІКА ВЕРШАЎ СЯРГЕЯ ПАНІЗНІКА «НАС МНОГА»**

***канд. філал. навук, дац. С.М. ЛЯСОВІЧ***
**Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Артыкул уяўляе сабой даследаванне ў галіне паэтычнай анамастыкі. У якасці матэрыялу назірання абраны зборнік вершаў сучаснага беларускага паэта, журналіста, публіцыста Сяргея Панізніка «Нас – многа!». Праведзены аналіз тапонімаў паводле частотнасці ўжывання, наяўнасці сярод іх прэцэдэнтных назваў, функцыі ў паэтычным тэксце, сэнсавага аб'ёму тапонімаў і інш. Выяўлена, што пры выбары паэтонімаў аўтар шмат у чым арыентаваўся на прастору Беларускага Падзвіння.*

Тапонімы складаюць значны па колькасці пласт лексікі і ўяўляюць сабой своеасаблівую падсістэму імёнаў уласных. Патэнцыял змястоўнасці тапонімаў вельмі вялікі, бо здаўна існавала традыцыя прывязваць назву месца да якой-небудзь асобы або падзеі. Таму за геаграфічнай назвай паўстае эпоха, традыцыя, жыццё нацы, гістарычны кантэкст. Яшчэ больш выразнымі і інфарматыўнымі становяцца тапонімы ў паэтычных тэкстах. На думку Г. Дзераваяга, іх асноўная задача – «устанаўленне магістральных прасторавых арыенціраў мастацкай карціны свету. Ідэі прасторы і часу складаюць каркас карціны рэальнай светабудовы і, увасобленыя ў тапанімных (ва ўзаемасувязі з хрананімнымі) канструктах ва ўмовах тэксту, ствараюць праекцыю прасторава-часовай мадэлі рэальнага свету ў сферы мастацкай умоўнасці.» [1, с. 93].

Сяргей Панізнік падчас сваёй грамадскай і паэтычнай дзейнасці шмат увагі надаваў пытанню нацыянальнай памяці. І ў захаванні гэтага пачуцця, у лучнасці пакаленняў вялікую ролю адыгрывае асэнсаванне лакалізацыі этнаса ў прасторы. Таму паэтычны ландшафт аўтара, прадстаўлены тапанімконам вершаў, уяўляе асаблівую цікавасць.

Пад тапонімам разумеюць уласную назву геаграфічнага аб'екта. Тэрмін уключае ў сябе гідронімы, урбанонімы, айконімы і інш. найменні, што абазначаюць кропку на карце, якая мае назву. Разгледзім некаторыя з іх, найбольш цікавыя з боку іх ролі ў мастацкім тэксце ў зборніку вершаў Сяргея Панізніка «Нас – многа!». Тапонімы падзяляюцца ў залежнасці ад тыпаў аб'ектаў, якія яны называюць: астыонімы – назвы гарадоў, харонімы – назвы краін, вялікай прасторы, рэгіёнаў, айконімы – назвы вёсак, урбанонімы – назвы ўнутрыгарадскіх аб'ектаў, эклезіонімы – назвы культавых пабудоў.

Самым пашыраным харонімам у зборніку "Нас – многа!" з'яўляецца «Беларусь», што лагічна, улічваючы грамадзянскі пафас паэзіі Сяргея Панізніка. Прычым цікава, што назва краіны ўжываецца аўтарам як назва мацерыка, такая гіпербала заснавана на ўжыванні побач з імем уласным імя агульнага, якое абазначае тэрыторыю, большую за тэрыторыю краіны, што сведчыць пра падкрэсліванне значнасці Радзімы для аўтара. Ужо ў эпіграфе да зборніка вершаў сустракаем: «*...усім сутворцам на мацерыку **Беларусь** прысвячаю*» [2, с. 1]; «***Беларусь** – мацярык трывушчы*»[2, с. 83].

Кола спалучальнасці тапоніма «Беларусь» стварае аўтарскі вобраз Радзімы: «***Беларусь** між Захадам і Ўсходам пазваніла ўключынай вясла*» [2, с. 27]; «*Мой шлях цераз раку – у **Беларусь**-скрыпторый*» [2, с. 39]; «***Беларусь** паўстала з кроплі.*» [2, с. 44]; «***Беларусь** – планеты жарало.*» [2, с. 68]. З прыведзеных кантэкстаў можна вылучыць канцэптуальныя метафары: Беларусь – гэта асяроддзе вучонасці (вобраз скрыпторыя), гэта човен, а вобраз шляху атаясамліваецца з ракой, гэта рух (*паўстала з кроплі* – згадка пра развіццё), мае прамежкавае становішча, але гэта цэнтр, з чаго вынікае этнацэнтрычнасць, ідэя нацыянальнай памяці.

Разам з тым Беларусь уяўляецца нечым нематэрыяльным, набліжаецца да духоўнай сутнасці, якая не мае канечнасці, межаў: «***Беларусь** у рэках патанае. **Мрояй** над азёрамі лунае.*» [2, с. 68]; «*...**П р а ж э к т а м** Беларусь ля губ.*» [2, с. 81]; «*І як такім жыццём не даражыць, дзе **Беларусь** – штодзённая **надзея**.*» [2, с. 85]; «***Беларусь** на белым свеце – мой і ўсіхны **добыт**.*» [2, с. 40]; «*Але любоў не спалавіняць, бо **Беларусь** – **бясконцая**!*» [2, с. 101]. Неабмежаваную працягласць у часе аўтар згадвае і ў адносінах малой радзімы – Прыдзвіння: «*...з намі бацяны **Прыдзвіння** будуць пасвіць тут вякі!*» [2, с. 17]; «*Краіна Перасялення Душаў – усё **Прыдзвінне**: мой вянец і продкаў межавы капец*».[2, с. 33]. Родная зямля – чысцец, месца, якое лучыць жывых і памерлых.

Трэба адзначыць ужыванне аўтарам канструкцый з формамі загаднага ладу ці ўмоўнага са значэннем загаднага: «*Я за краіну для жытла, дзе сэрца – не прытворны грузік, – дзе з намі **Беларусь была б і ў Беларусі**.*» [2, с. 44]; «***Хай гляне Беларусь** нявестай!*» [2, с. 47]; «***Няхай бы Беларусь змагла** з Канадай гудбай парадніцца: гучаў бы сімвал-атрыбут валынкай – там, дудою – тут.*» [2, с. 57]; «***Хай стане** Кнігай Вечнай і **Беларусь** уся!*» [2, с. 91]. Імператывы, прапанаваныя паэтам абагачаюць сэнсамі аўтарскі канцэпт «Беларусь». Акрамя традыцыйнага жаночага вобраза, з якім часта параўноўваюць краіну ў літа-



Polotsk SU

ратуры, у першым кантэксце Беларусь у значэнні геаграфічнага паняцця супрацьпастаўляецца паняццю Беларусь у значэнні «духоўны скарб беларускай культуры». Дуда – згаданы сімвал краіны звяртае якраз да паняцця Беларусі, як духоўнай сутнасці. Тое ж можна сказаць пра вобраз Вечнай Кнігі ў апошнім кантэксце.

Для паэта назва краіны – гэта частка самаідэнтыфікацыі, таму пра важнасць таго, як завецца краіна суседзямі, верш «Балцкая Крывія». У вершы згадваюцца некалькі харонімаў. Адштурхоўваючыся разважаннямі ад назвы *Балкрывія* (Baltkrievia – назва Беларусі ў Латвіі), што ў дакладным перакладзе – «Белая Расія», С. Панізнік згадвае другія назвы, дадзеныя іншымі народамі: «*Сестрёнка наша* ***Белоруссия***»; «*...нібыта выцялі патэльняю –* «***Вайсрусландам***» «***Беларутэнію***»» [2, с. 58]. Усе найменні, прыведзеныя ў вершы, нагадваюць пра падначаленае становішча нашых земляў – ці то рускім, ці то немцам, і таму яны набываюць адмоўную канатацыю з вуснаў лірычнага героя.

Значная колькасць тапонімаў у вершы «Хварэю на суседзяў» пазначае гістарычныя стасункі беларусаў і прыўносіць у канцэпт «Радзіма» значэнне «мультыкультурная прастора»: *Латвія, Летува, Варшава, Чарнігаўшчына, Львоў, Смаленск*. У вершы ўжыты тапонімы-архаізмы, якія намякаюць на тэрытэрыяльныя прэтэнзіі суседскіх дзяржаў, звяртаюць да гістарычных падзей, што гэтага датычацца: «*...баяцца* ***Лівонію*** *аддаць.*»; «*На санацыйных* ***Крэсах*** *лячыся сам, агрэсар.*»; «*Абдымачкі* ***Смаленска*** *падцiснуў* ***Петраград****...*» [2, с. 56]. Харонім «Лівонія» нагадвае часы, калі сучасныя латышскія землі былі ў залежнасці ад Полацкага княства і пасля ад Рэчы Паспалітай, найменне «Крэсы» прыгадвае пра падзел беларускіх земляў з палякамі не на карысць апошніх, а асціонім «Петраград» вяртае ў перыяд выкарыстання назвы, калі Смаленск са складу БССР быў пераведзены ў склад РСФСР. Такім чынам тапонімы-архаізмы адсылаюць да прэцэдэнтных сітуацый, дэкадзіруюць кантэкст.

Акрамя самага частотнага тапоніма *Беларусь*, у зборніку «Нас – многа!» зафіксаваны (у дужках пазначана колькасць ужыванняў) **харонімы**: Еўропа (4), Прыдзьвінне (3), Рэч Паспалітая (2), Готланд (2), Балтыка, Чарнігаўшчына, Прыбалтыка, Мёршчына, Ігуменшчына, Чэрвеншчына, Латвія, Лівонія, Летува, Браслаўе, повят Браслаўскі, Аўстралія, Атлантыда; **астыонімы**: Полацк (9), Вільня (7), Рыга (4), Парыж (4), Віцебск (3), Львоў (3), Пецярбург (3: Піцер, Петраград), Дзісна (2), Менск (2), Рым (2), Масква (2), Маладзечна (2), Мір (2), Нью-Ёрк (2), Гальшаны, Слуцак (Слуцк), Берлін, Белаазёрск, Ерусалім, Брэст, Смаленск, Варшава, Юрмала, Барысаў, Жэнева, Прага, Мёры, Кінкардэн, Пскоў, Апочка, Чарнобыль, Дрыса, Нерынгры, Дуброўна, Туніс, **айконімы**: Лявонпаль (8) Мілашова (3), Міхайлаўскае (2), Латышы, Друя, Мётлы, Ідолта, Дзедзіна (2), Камянполле, Каланіца, Хабароўка, Язна, Чурылава, Забалоцце, Слабада, Снегі, Міжрэчча, Мормаль, Узмёны, Чэрасы, Рукойны, Свіраны, Кушляны, Жупраны, Павет, Масцішчы, Загасцінец, Устронь; **гідронімы**: Дзвіна, Рубон-Дзвіна (14), Волга (6), Гурон (2), Мерыца, Чорная рэчка, Нява, Дунай, Селігер, Вята, Ніл, Снівадзь, Палата, Прыпяць, Янцзы, Каўка; **найменні гор**: Парнас, Ай-Петры, Галгофа, Везувій, Афон; **урбанонімы**: Сафійка (2), Чарнарэчанская (вуліца) Серафімаўскі цвінтар, Версаль, Царскае Сяло; **мікратапонімы**: Лявонпальская крыніца, Крыж, Хеопс, Крылацкія Халмы.

У вершах аўтара занатаваны памкненні і арыентаванасць беларусаў да Еўропы, прычым у іранічным ключы: «*Бачыць: тут акно ў* ***Еўропу*** *пратаранена даўно.*» [2, с. 76]; «*Яна з Масквы хадой удумнаю разгойдвала* ***Еўропу*** *тлумную, – і праз натхнёны пераклад зноў Беларусь знайшла пасад.*» [2, с. 94]; «*...прабягала ў* ***Еўропу****, але збілася з тропу*». [2, с. 97]; «*...толькі б ногі прамчалі праз усе перашкоды ў* ***Еўропе*** *звыроды Беларусь не чапалі: з ёй нашу я народы.*» [2, с. 97]. Прыём іроніі рэалізаваны праз трансфармацыю ўстойлівых выразаў («*акно ў Еўропу* ***пратаранена***»), праз ужыванне выразаў са значэннем руху, накіраваным да Еўропы, з выкарыстаннем лексем, нехаратэрных для абазначэння перасоўвання на значную адлегласць («***хадой удумную разгойдвала*** *Еўропу*», «***прабягала*** *ў Еўропу*», «*ногі* ***прамчалі***»).

Самы частотны айконім – Лявонпаль, вёска, дзе прайшло дзяцінства паэта: «*Прытулак Селюнам нясу ў* ***Лявонпаль****. Там ачуецца ў музеі галава.* ***Лявонпаль*** *– радаводны маўзалей.*» [2, с. 20]; «*І* ***Полацак, Бігосава, Лявонпаль, Мёры, Дрыса*** *нясуць да Бога босага Панізьнікаў абрысы.*» [2, с. 21]; «***Слабада, Лявонпаль, Снегі*** *– Гэта нашы абярэгі.*» [2, с. 24]; «*Хто змог з* ***Лявонпальскай крыніцы*** *піць, – цяпер асуджаны ў атлантах быць.*» [2, с. 25]. З прыведзеных кантэкстаў вынікае канцэптуальная метафара «мястэчкі – заступнікі». Паэт надзяляе мястэчкі функцыямі анёлаў-заступнікаў, што звязваюць свет людзей і бога, далучанасць да мястэчак – перадумова поспеху.

Сувязь чалавека з месцам, адкуль ён паходзіць, зафіксавана ў шэрагу антрапонімаў, часткай якіх быў тапонім: «***Адэля з Устроні, Мікола з Гусава, Гаўрыла з Полацка, Яська-гаспадар з-пад Вільні, Сымон Рэўка з-пад Барысава****... А былі яшчэ і пашпартныя беларусы.*» [2, с. 62]. Прыгадаўшы псеўданімы, абраныя літаратарамі XIX ст., – Цёткай, Кастусём Каліноўскім, Францішкам Багушэвічам, аўтар па аналогіі стварае антрапонімы па мадэлі «уласнае імя + месца паходжання», якая прадуктыўна выкарыстоўвалася ў часы да XX ст. Мяркуем, невыкарыстанне аўтарам прозвішча Гусоўскага наўмыснае: папершае, для структурнага адзінства кантэксту, па-другое, для ўзмацнення акцэнту на месцы паходжання чалавека, на яго каранях.

Выкарыстанне С. Панізнікам тапонімаў, што абазначаюць геаграфічныя аб'екты іншых краін як правіла абгрунтавана памяццю зноў-такі пра Радзіму. У вершы «На друйска-дзісенскім шляху» аўтар

прыгадвае мастака Віктара Жаўняровіча, якому ў эміграцыі помніцца Радзіма. Паралельна ўжываюцца тапонімы, з якімі звязана яго замежнае жыццё, і беларускія, што маюць на мэце падкрэсліць ідэю вернасці малой радзіме: Парыж, Нью-Ёрк, Версаль з аднаго боку і Язна і Друя з другога: «*Эцюд мо і ў **Нью-Ёрк** сплыве... Маляр глядзіць на **Язна**. Ў яго прыдзвінскай галаве як на мальберце ясна.*» [2, с. 29]. У вершы пра Альгерда-Якуба Абуховіча, графа Бандынэлі згадваюцца Рым, Парыж, Жэнева і супрацьпастаўлены ім Слуцк: «*Жнівень прычакае ў **Слуцку** Абуховіча радню*» [2, с. 82].

Вершы, прысвечаныя вядомым землякам так ці інакш маюць згадку пра малую радзіму асобы: «*Чарговыя адведзіны хлапчыны з вёскі **Дзедзіна**...*» [2, с. 29] – пра Рышарда Курыльчыка; «*Ляцелі над **Дзвіной** на крылах Вы: хацелі з навіной ў **Чурылава**.*» [2, с. 25] – прысвячэнне Зінаідзе Лакотцы; «*Ты з **Менску** на **Прыдзвінне** глядзіш не з вышыні.*» [2, с. 27] – прысвячэнне Міколу Крыўко. У апошніх кантэкстах тапонімы традыцыйна абазначаюць канечную кропку ў накірунку руху, але ў паэтычным тэксце гэта рух не матэрыяльных аб’ектаў, а думак, душы.

Напэўна, цяжка адшукаць верш, дзе б згадка той ці іншай вядомай асобы не суправаджалася згадкай і месца, звязанага з жыццём гэтай асобы: «*...і будзе **Данута** як тая маліна – наводдаль **Масцішчаў** у плойме анёлаў, дзе вецер не свішча, не чутна шумёлаў, дзе стаў **Загасцінец** мурожнаю поўняй...*» [2, с. 82]; «*На **Чэрвеншчыне** – лаўка, з якой падскочыў **Каўка** і ўсеўся на каня...*» [2, с. 83]; «*Трымаў Сусвет з гняздом у **Забалоцці**.*» (пра Генрыка Дмахоўскага)[2, с. 28].

З гарадоў С. Панізнік часцей за іншыя згадвае Полацк і Вільню: «*...І маё месца пад сонцам пачыналася з **Полацка**.*» [2, с. 60]; «*Чым налітая яна, неаліту сівізна? Тут і рунаў ярына, **Полацка** аглядка...*» [2, с. 13]; «*Вунь – **Полацак**-Вянок!*» [2, с. 39]; «*...На Готланд ветразь мой плыве, натхнёны вечным **Полацкам**.*» [2, с. 59]; «*Пасля ўрачыстай працы да **Полацка** дабрацца б!*» [2, с. 69]; «*На Воршу, Слуцак з любасцю глядзіць. А ў сэрцы ж у Міколы **Вільня** б’еццa!*» [2, с. 78], «*Тут не Ай-Петры, тут не быў паэт, якому **Вільня** назаўжды сталіца...*» [2, с. 54]. У кантэкстах у склад канцэпта «Полацк» далучаюцца такія сэнсы: пачатак і мэта развіцця, руху асобы, старажытнасць, вечны. Ужытае ў адносінах Полацка азначэнне «Вянок», мяркуем, звяртае да нізкі духоўных здабыткаў, звязаных з горадам. Што да Вільні, то яна таксама прадстаўлена цэнтрам духоўных памкненняў беларускіх мастакоў. Семантыку цэнтра рэалізуюць лексемы, якія маюць у сваім складзе гэтую сему – *сэрца* і *сталіца*. У апошнім кантэксце тапонімы – ключ да разумення, пра якую асобу згадвае аўтар: у ялцінскіх мясцінах знаходзіўся, сягаючы думкамі да Вільні, Максім Багдановіч.

Дзвіна – самы частаўжывальны гідронім і тапонім увогуле пасля хароніма *Беларусь*, да якога гідронім падобны і рэалізаванымі ім сэнсамі: «*На беразе жыцця, на беразе **Дзвіны** стаіць вялікі рум яшчэ з часоў вайны. Сцякае з бервяна жывіцы даўніна. А беражэ той рум і **Волга**, і **Дзвіна**.*» [2, с. 11]; «*Над роднаю **Дзвіною** – серабро Яшчэ не звечарэлае зары...*» [2, с. 15]; «*У думках – там, дзе пад брылём Ілля намерыўся ў **Дзвіну** спусціць ільдзіну.*» [2, с. 14]; «*Лячу! Насустрач круціцца Зямля. Вунь і **Дзвіна** – за першым паваротам.*» [2, с. 14]; «*А мне б з **Дзвіны** напіцца.*» [2, с. 54]. Рэчкам «малой» радзімы прыпісваецца ахоўная функцыя, Дзвіна родная, гэта аб’ект памкнення думак лірычнага героя, які вызначае накірунак руху. Працэс ацэньвання блізкасці з ракой (кім прыходзіцца герой рацэ?) ператвараецца ў працэс ацэнкі (самаацэнкі): «***А я Дзвіне – ніхто**, пакуль (як ні лаўчы) ляжаць мае сцягі, маўчаць мае мячы.*» [2, с. 11]; «***Ён Дзвіне не валацуга**: быў жа і на Гербе!*» [2, с. 86]. У склад семантычнай структуры канцэпта «Дзвіна» дадаецца сэнс «мерыла вартасці».

Паказальна, што з усіх беларускіх рэк, аўтар прыгадвае толькі водныя артэрыі «малой» радзімы і Прыпяць: «***Дзвіна** Балкрывію ўрасіла.*» [2, с. 57]; «*Заблукаў Майсей між **Дзвіною** і **Прыпяццю**.*» [2, с. 61]; «***Волга** ўся не рачулкай-качулкай плыве – **Дунаем**! З ёй мы сваяцтва палабскага славянства узгадняем. **Волга** і цяпер вядзе між пнёў, агародаў Вялікае Перасяленне Народаў.*»; «*З ёй на **Дзвіне** і крэслы-парогі каменныя перакулю...*» [2, с. 14-15]. Значнасць рачулкі сваёй радзімы аўтар падкрэслівае, параўноўваючы яе са значна большай ракой – Дунаем, а таксама надае ёй ролю чынніка знакавых падзей славянскай гісторыі. Прычым моц ракі жывіць сваёй сілай і лірычнага героя.

Міфалагічны ландшафт нацыянальнай памяці прадстаўлены тапонімамі *Крывіцкая зямля, Рубон, Крывія*: «*Сведкі – Чэрасы, Дзісна І рака **Рубон-Дзвіна**.*» [2, с. 24]; «*З ім і я жыву, **Рубону** шчыра верую.*» [2, с. 58]. У першым кантэксце ўжыванне складанага тапоніма *Рубон-Дзвіна* – гэта зварот да мінуўшчыны, калі раку называлі па-іншаму, актуалізацыя ідэі пераемнасці. У другой дыстрыбуцыі рака выступае сімвалам старажытнасці і памяці, якой аўтар пакланяецца. Мяняецца прагматычная функцыя тапонімаў – яны не толькі захоўваюць гістарычную памяць, але і актуалізуюць ідэйныя ўстаноўкі і перажыванні асобы. Тапонім становіцца не столькі дарожным, геаграфічным арыенцірам, колькі жыццёвым.

Ужыванне тапонімаў можа быць узорам ужывання прэцэдэнтных імёнаў: «*На **Сінівадзе** – Ардзе, бядзе – Падпругі не рассечаны. Ў сядло, Альгерд! А мы – услед.*» [2, с. 79]; «*А рэха рыфмы круціць над крыніцай: **Рукойны** – **Свіраны**. **Кушляны** – **Жупраны**.*» [2, с. 91]. У першым кантэксце тапонім згадвае бітву (увосень 1362 г.), што адбылася паміж войскамі ВКЛ і аб'яднаным войскам Крымскай, Перакопскай і Ямбалукскай ардаў на р. Сінія Воды (Сінюха, Снівада; левы прыток Паўднёвага Буга). Бітва была

галоўнай падзеяй у наступленні ВКЛ на падпарадкаваныя татарам землі паўднёва-заходняй Русі, перамога ў ёй аддала Альгерду ўсё Падолле. Тапонім канцэнтруе ў сабе сэнсы імплікацыі да рашучых дзеянняў. У другой дыстрыбуцыі тапонімы выступаюць прэцэдэнтнымі адзінкамі, якія звяртаюць да прэцэдэнтных сітуацый нараджэння (Свіраны), хрышчэння (Рукойны), жыцця-навучання (Кушляны) і вечнага спачынку (Жупраны) Францішка Багушэвіча. Такім чынам, тапонімы служаць шляхам для ідэнтыфікацыі, распазнавання вядомай асобы да якой звяртае аўтар.

Тапонімы пры абазначэнні геаграфічных аб'ектаў прадугледжваюць выступаць мэтай руху. Таму невыпадкова частотным вобразам, які сустракаецца разам з імі, выступае вобраз дарогі: «*Пакуль што **Беларусь** – вось: белы луг, які аточвае сабой **дарогу** праз цішыню ці ўсплёскі завірух.*» [2, с. 79]; «*О, **Беларусь**, твой зоўны лёс – **дарога**.*» [2, с. 65]. «*Пісаў жа ты вершы у Бронзавым веку, калі на **Падзвінні** адкрылася **ляда**.*» Лексема ляда малюе вобраз шляху, які праходзіў па Падзвінні, далучанасць нашай зямлі да руху гісторыі. Шлях таксама можа стаць тапонімам, калі ён абазначае паўтаральны маршрут ад кропкі да кропкі на карце: «***Шлях з Грэкаў у Варагі** – у вірах. А ён жа азалочваў і нявесціў. **Шлях Віленскі** цар-бацюшка праспаў, пасля баранаваў яго каронай. **Варшаўскі** – знік. І **Полацкі** прапаў... **Чарнобыльскі** гудзіць пад забаронай.*» [2, с. 73]. Для аўтара шлях з паняцця адлегласці ад кропкі да кропкі ператвараецца ў катэгорыю культуры, духоўнай культуры.

Праведзены аналіз засведчыў, што тапонімы – адна з прадуктыўных груп лексікі ў складзе аўтарскага ідэастылю, якая валодае шырокім дыяпазонам сэнсаў і функцый. Паводле колькасці ўжывання самая шырокаўжывальная група тапонімаў – асціонімы, хаця сярод тапонімаў вылучаецца харонім *Беларусь*. Сярод айконімаў – большасць найменняў абазначае кропкі на карце малой радзімы С. Панізніка – Падзвіння. Тапонімы часта выкарыстоўваюцца як суправаджэнне аповеду пра нейкую асобу – гэта спосаб яе прадстаўлення і ідэнтыфікацыі. У семантыцы оніма, такім чынам, сканцэнтраваны лінгвістычныя і экстралінгвістычныя звесткі. Звычайна тапонімы выступаюць у сваёй асноўнай функцыі – вылучаюць геаграфічны аб'ект і суадносяць з ім намаляваныя ў паэтычным тэксце падзеі. У паэзіі Сяргея Панізніка іх функцыя – не канкрэтызацыя руху матэрыяльных аб'ектаў у прасторы (куды?), а рух душаў да родных месцаў, лакалізацыя паходжання (адкуль я?).

Сэнсавы кампанент тапонімаў аказваецца істотным, бо расказвае аб гісторыі, культурна-гістарычных асаблівасцях месца. Такім чынам, геаграфічнае найменне валодае багатым асацыятыўным фонам, што дазваляе казаць пра яго выяўленчыя магчымасці ў мастацкім тэксце, асабліва для перадачы аўтарскага эмацыйна-ацэначнага ўспрымання, ступені аўтарскай прыхільнасці, відавочнай і паэтычна важкай.

Паэтычны ландшафт аўтара уяўляе асаблівую цікавасць у асэнсаванні лакалізацыі этанаса ў прасторы, адыгрывае вялікую ролю ў захаванні нацыянальнай памяці. У сваёй творчасці аўтар звяртаецца да выяўлення месцаў, якіх ужо няма на карце. Гэтыя тапонімы, з аднаго боку назаўсёды застаюцца ў свядомасці лірычнага героя, з іншага, дапамагаюць захаваць ім этнічную самаідэнтыфікацыю. Прааналізаваны матэрыял паказвае, што многія тапонімы, ужытыя аўтарам у вершах, уваходзяць у структуру канцэпта «Радзіма», раскрываючы розныя сэнсы гэтага паняцця.

Пераважная большасць геаграфічных назваў у паэтычных тэкстах выконвае намінатыўную функцыю, бо выкарыстаныя топалексемы адлюстроўваюць сувязь з рэчаіснасцю, ствараюць яе праўдзівую карціну. Акрамя асноўнай функцыі, тапонімы ў тэксце верша могуць набываць характаралагічнае значэнне, раскрываючы розныя бакі названага імі аб'екта, што вельмі важна, бо змест і форма геаграфічнага аб'екта могуць гістарычна змяняцца і ў розныя перыяды могуць быць рознымі.

Тапонімы дэкадзіруюць паэтычны тэкст, звяртаючы да прэцэдэнтных сітуацый і імёнаў, актуалізуюць ідэйныя ўстаноўкі і эмацыянальную танальнасць вершаў аўтара, выконваюць важную выяўленчую функцыю.

ЛІТАРАТУРА

1. Деревяго, А.Н. Имя собственное в художественном тексте : учеб.-метод. пособие / А.Н. Деревяго. – Витебск : УО «ВГУ им. П.М.Машерова», 2008. – 239 с.
2. Панізнік, С. Нас – многа! / С.Панізнік. – Мінск : Тэхналогія, 2012. – 126 с.

**TOPONYMS IN THE BOOK «THERE ARE A LOT OF US» BY SIARHEY PANIZNIK**

***S. LIASOVICH***

*The article deals with the research in the field of literary onomastics. The study focuses on the book of poems «There – are a lot of us!» by Sergey Paniznik, a modern Belorussian poet, journalist and a publicist. The poetonyms are analyzed according to their frequency, the occurrence of precedent names among them, the function in the literary text, the semantic scope of toponyms, etc. Attention is drawn to the poetonyms in Paniznik's poetry. It is concluded that the author's choice of the poetonyms is based on the culture of Belorussian Podvinje.*



PolotskSU